органов внутренних дел. Если в сложившихся условиях глобализационных процессов сотрудник милиции ощущает себя гражданином всемирного пространства с размытыми границами, где мировые глобальные тенденции затеняют интересы отдельно взятых стран, где бренды заменяют традиции, где пассивная унификация заменяет богатый и разнообразный внутренний мир, то это, в свою очередь, накладывает свой негативный отпечаток на мотивацию и может негативно сказываться на модели поведения сотрудника милиции на работе и дома. Безусловно, мировоззрение не складывается единожды. Оно складывается и формируется под воздействием социальных условий, воспитания и образования, имеет свою сферу влияния как на индивидуальном, так и общественном уровне. Говоря о структуре мировоззрения, необходимо выделить ее неотъемлемые части: мироощущение (эмоционально-психологическая сторона мировоззрения), мировосприятие (формирование образов мира через наглядные представления) и миропонимание (познавательно-интеллектуальная сторона).

Анализ литературы, описывающей понятие мировоззренческой культуры, представляет целесообразным принять определение ее как способность человека реагировать на воздействие окружающего мира, внося этим свою ценность. Важным представляется то, что мировоззрение не просто включено в культуру, оно выступает как форма деятельности. Это значит, что мировоззренческая культура сотрудника органов внутренних дел должна не навязываться со стороны, а вырабатываться им самим, его собственным трудом. На современном этапе развития белорусского общества становится очевидной задача повышения уровня мировоззренческой культуры сотрудников органов внутренних дел. Сегодня белорусское общество как никогда нуждается в сотрудниках органов внутренних дел, которые осознают свою профессиональную деятельность и свое место в ней, у которых сформировано чувство психологической защищенности и активное отношение к наблюдаемым явлениям.

Нами было проведено анкетирование сотрудников органов внутренних дел по изучению мотивации служебной деятельности с целью анализа осознания личностного смысла и своего мировоззренческого самоопределения исходя из профессиональной компетентности сотрудников. Полученные результаты показали, что 75 % заинтересованы в деятельности по избранной профессии. Личную ответственность за сохранение региональной культуры осознают 80 %, у 20 % отмечается низкая персональная потребность в мировоззренческом развитии. Полученные данные доказывают необходимость и практическую значимость разработки новых подходов к процессу формирования мировоззренческой культуры среди сотрудников органов внутренних дел.



УДК 316.75

***А.М. Сувалава,*** старшы выкладчык кафедры філасофіі і ідэалагічнай работы Акадэміі МУС Рэспублікі Беларусь

## ФАРМІРАВАННЕ СВЕТАПОГЛЯДНАЙ КУЛЬТУРЫ СУПРАЦОЎНІКА ОРГАНАЎ УНУТРАНЫХ СПРАЎ

Светапоглядная культура асобы з'яўляецца важным фактарам у фарміраванні грамадства XXI ст. і ўплывае на ўсе аспекты грамадскага жыцця. У сучасны момант змяняюцца ўмовы ўзаемаадносін асобы, грамадства і дзяржавы, аб'ектыўна актуалізуецца патрэбнасць светапогляднага самавызначэння асобы.

Прафесійная дзейнасць супрацоўнікаў праваахоўных органаў непарыўна звязана з працэсамі жыццядзейнасці сучаснага грамадства, што, у сваю чаргу, вызначае асноўныя кірункі і тэндэнцыі падрыхтоўкі сучаснага супрацоўніка органаў унутраных спраў. Праблеме фарміравання прафесійнай кампетэнтнасці і культуры супрацоўніка сістэмы МУС надавалася і надаецца належная ўвага. Аднак пры гэтым сёння неабходна накіроўваць намаганні і на фарміраванне светапоглядных каштоўнасцяў асобы будучага праваахоўніка, прычым ужо ў працэсе яго навучання. Ажыццяўляць прафілактыку правапарушэнняў, эфектыўна змагацца са злачыннасцю, усведамляць сваю грамадзянскую адказнасць здольны толькі супрацоўнік, які мае духоўна-маральныя якасці асобы, адданы ідэалам свайго народа і перакананы ў сацыяльнай значнасці сваёй дзейнасці.

Тэрмін «светапогляд» традыцыйна выкарыстоўваецца як філасофскае паняцце, якое азначае сукупнасць устойлівых поглядаў, прынцыпаў, ацэнак і перакананняў, якія вызначаюць стаўленне чалавека да навакольнай рэчаіснасці і характарызуюць бачанне свету ў цэлым і месца чалавека ў гэтым свеце. Такім чынам, светапогляд ўяўляе сабой сістэму суб'ектыўных вобразных уяўленняў аб жыцці.

Светапоглядная культура супрацоўнікаў МУС – гэта пэўны ўзровень мыслення і ўспрымання рэчаіснасці, цэласная прафесійна-асобасная якасць, якая адлюстроўвае гатоўнасць і здольнасць супрацоўніка мэтанакіравана ажыццяўляць прафесійную дзейнасць ва ўзаемадзеянні з іншымі суб'ектамі грамадства.

Узровень каштоўнасна-светапогляднай культуры асобы курсантаў вызначаецца праз разуменне і засваенне свету, праз асобаснае светаадчуванне, светаразуменне, светасвядомасць, а таксама самаўдасканаленне і самавызначэнне. Гэта значыць, што праблема фарміравання каштоўнасна-светапогляднай культуры асобы павінна абапірацца на аксіялагічны (каштоўнасны) падыход. Каштоўнасці – гэта ўяўленні



PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

большасці людзей пра дабро, прыгажосць, справядлівасць, адвагу, патрыятызм і пра многае іншае. Базу фарміравання прафесійна арыентаванай каштоўнасна-светапогляднай культуры будучага супрацоўніка праваахоўных органаў складаюць такія каштоўнасці, як прыхільнасць ідэям дэмакратыі, грамадзянская сталасць і грамадская актыўнасць; сфарміраванасць прафесійнай этыкі; беражлівыя адносіны да агульначалавечых і сацыяльных каштоўнасцяў; паважлівае стаўленне да законаў і правоў чалавека; пачуццё прафесійнага абавязку; адказнае стаўленне да міжасобасных адносін, да лёсу сяброў, родных, іншых людзей; захаванне этыкі міжасобасных і міжнацыянальных адносін; прафесійная самаадданасць.

Задача фарміравання і замацавання такіх светапоглядных установак выклікае неабходнасць мадэрнізацыі юрыдычнай адукацыі, працэс якой ускладняецца ростам аб'ёмаў прафесійнай інфармацыі. Гэта патрабуе ад устаноў вышэйшай адукацыі абнаўлення зместу і распрацоўкі новых педагагічных тэхналогій фарміравання светапоглядных і прафесійных каштоўнасцяў у сістэме падрыхтоўкі праваахоўных кадраў. Змены перш за ўсё павінны закрануць мэты і стратэгічную накіраванасць прафесійнай адукацыі.

Адукацыйны працэс у навучальных установах МУС павінен грунтавацца на выяўленні спецыфічных фактараў культуры і навучанні курсантаў на аснове міжпрадметнага і міждысцыплінарнага падыходаў (філасофскага, палітычнага, эстэтычнага, этычнага, культуралагічнага, сацыялагічнага, педагагічнага і інш.), на аксіялагічнам падыходзе да фарміравання каштоўнасна-светапогляднай культуры асобы курсантаў.

Праблемы фарміравання маральнасці, светапогляду, грамадзянскасці, гуманізму ў курсантаў адукацыйных устаноў МУС непасрэдна звязаны з пытаннямі выкарыстання новых педагагічных тэхналогій у адукацыйным працэсе ва ўмовах мадэрнізацыі айчыннай сістэмы адукацыі з улікам асноўных тэндэнцый развіцця педагагічнай тэорыі і практыкі.

У сучасны момант у значнай часткі курсантаў адзначаецца наяўнасць устойлівых каштоўнасных адносін да сваёй прафесійнай дзейнасці як асабіста значнай, але пры гэтым мае месца і слабая выяўленасць сацыяльна-сэнсавых і творчых матываў прафесійнага выбару, накіраванасці курсантаў на фарміраванне ў сабе аналітычных уменняў дзейнасці, спосабаў персанальнага самапазнання, маральнай самаадукацыі і інш.

Фарміраванню адпаведнай светапогляднай, а таксама высокай прававой і палітычнай культуры супрацоўніка органаў унутраных спраў закліканы спрыяць сацыяльна-гуманітарныя дысцыпліны. На жаль, у сучасных умовах пералік прадметаў гуманітарнага цыкла, уключаных у вучэбныя праграмы ўстаноў вышэйшай адукацыі, істотным чынам скарочаны, а на тыя дысцыпліны, што засталіся, такія як філасофія,



гісторыя, паліталогія, сацыялогія, адводзіцца нязначная колькасць вучэбных гадзін. Такая сітуацыя істотным чынам абмяжоўвае як каштоўнасна-светапоглядны патэнцыял сацыяльна-гуманітарных дысцыплін, так і магчымасці выкладчыка ў фарміраванні светапоглядных якасцяў і асобасных арыентацый курсанта.

Не менш значным у фарміраванні каштоўнасна-светапогляднай культуры будучага праваахоўніка з'яўляецца такі кірунак, як ідэалагічная работа ў органах унутраных спраў. Яе мэта – фарміраванне ў супрацоўнікаў патрыятызму, грамадзянскай пазіцыі, адказнасці, маральнай, палітычнай і прававой культуры, а таксама павышэнне эфектыўнасці вырашэння супрацоўнікамі задач па забеспячэнню нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь.

Ідэалагічная работа ўключае ў сябе выхаваўчую, інфармацыйна-прапагандысцкую, сацыяльна-прававую работу, сацыякультурную дзейнасць, работу па ўмацаванню дысцыпліны. Усе гэтыя кірункі закліканы ўздзейнічаць на свядомасць, светапогляд, волю і пачуцці супрацоўнікаў у мэтах фарміравання ў кожным з іх ідэйна-маральнай, усебакова развітай асобы, гатовай свядома і якасна выконваць свае службовыя абавязкі. Акрамя таго, у працэсе ідэалагічнай работы ідзе фарміраванне актыўнай жыццёвай пазіцыі, шырокага сацыяльна-прававога кругагляду, павышэнне ўзроўню службовай і асабістай культуры супрацоўнікаў, іх далучэнне да традыцыйных культурных каштоўнасцяў, здаровага ладу жыцця, фарміраванне службовых традыцый і рытуалаў.

У ідэалагічнай работы маюцца шырокія выхаваўчыя магчымасці і каштоўнасна-светапоглядны патэнцыял. Аднак на якасць і эфектыўнасць ідэалагічнага ўздзеяння аказваюць ўплыў методыка і прыёмы яго ажыццяўлення. На сучасным этапе існуюць два асноўныя падыходы да разумення сутнасці ідэалагічнай работы – функцыянальны і сутнасна-сістэмны.

Першы (вядомы па савецкіх часах) – прагматычны, механістычны падыход да выхавання грамадзян: яго рэальныя вынікі часта замяняліся колькасцю прачытаных лекцый, праведзеных гутарак, палітінфармацыяй, апублікаваных кніг, брашур і г. д. За масавымі мерапрыемствамі, калонкамі лічбаў, справаздачамі не было відаць рэальнага чалавека, што прыводзіла да значнага зніжэння выхаваўчага і сацыяльнага эфекту ідэалагічнай работы, да абсалютызацыі ідэалагічных формаў выхавання ў шкоду зместу выхаваўчай працы. Замест выхавання творчай асобы ўся ўвага была засяроджана на яе фарміраванні па ўзору, у выніку чаго людзі развучыліся самастойна думаць, вырашаць праблемы, якія стаялі перад імі, а савецкае грамадства з рэжыму актыўнага развіцця перайшло ў рэжым простага функцыянавання і ўзнаўлення ўжо існаваўшых культурных формаў. У канчатковым выніку дадзены



PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

працэс павярнуўся разбурэннем дзяржавы і пераацэнкай усёй сістэмы каштоўнасцяў.

Другое разуменне ідэалагічнай работы – сутнасна-сістэмнае – найбольш каштоўнае ў сучасную эпоху. Яно арыентавана на пазнанне, усведамленне і прыняцце асобай асноўных ідэй, прынцыпаў, прыярытэтаў грамадства і дзяржавы, прыняцце базавых каштоўнасцяў беларускай нацыі, фарміраванне светапогляду на аснове дасягненняў навукі, тэхнікі, інфармацыйных тэхналогій, усведамленне дзяржаўнай стратэгіі ў сферы эканомікі, права, адукацыі, аховы здароўя, сацыяльнай абароны насельніцтва і г. д. Менавіта такі падыход найбольш эфектыўны пры працы з курсантамі, паколькі ў большай ступені арыентаваны на іх індывідуальна-асобасныя патрэбнасці, на павышэнне гуманістычнага складальніка іх прафесійнай дзейнасці, на распрацоўку новых падыходаў да фаміравання каштоўнасна-светапогляднай культуры асобы курсантаў.

Такім чынам, фарміраванне светапогляднай культуры супрацоўніка органаў унутраных спраў павінна пачынацца ўжо ў працэсе яго навучання ва ўстановах адукацыі МУС і ўяўляць сабой педагагічна накіраваную, цэласна пабудаваную сістэму сукупных дзеянняў як у рамках непасрэдна адукацыйнага працэсу, так і ў ходзе правядзення ідэалагічнай і выхаваўчай работы.

УДК 343.2

***А.В. Швайка***, доцент кафедры юридических дисциплин факультета внутренних войск Военной академии Республики Беларусь;
***Л.М. Брайчук***, старший преподаватель кафедры юридических дисциплин факультета внутренних войск Военной академии Республики Беларусь

## ФОРМИРОВАНИЕ ПРАВОВОЙ КУЛЬТУРЫ СОТРУДНИКОВ ОРГАНОВ ВНУТРЕННИХ ДЕЛ, ВОЕННОСЛУЖАЩИХ КАК НЕОБХОДИМОЕ УСЛОВИЕ ОБЕСПЕЧЕНИЯ ЗАКОННОСТИ И ПРАВОПОРЯДКА

Формирование правовой культуры сотрудников органов внутренних дел, военнослужащих является средством выхода из многих тупиковых ситуаций, возникающих в процессе их профессиональной деятельности, основой оптимизации системы правовой культуры в целом. Сам термин «формирование» обычно употребляется для обозначения



порождения каким-либо явлениям определенной формы. Формирование применительно к воспитанию человека – это наиболее широкое и всеобъемлющее понятие. Однако вместе с воздействием объективных и социальных условий формирование предполагает и целенаправленное воспитание и самовоспитание под влиянием субъективного фактора.

Формирование является общенаучным понятием и часто употребляющимся термином разговорного языка. В применении к социальным явлениям данное слово отражает процесс, происходящий под влиянием условий и образа жизни людей, а также качественно новую стадию развития социального процесса. Таким образом, сложилась точка зрения на процесс формирования как фрагмент социального развития, способ его осуществления. Несомненно, необходимо учитывать, что процесс формирования правовой культуры личности протекает в определенных объективных условиях; в ходе служебной деятельности; под воздействием субъективных устремлений социальных сил, организаций, начальников.

Взаимосвязь отмеченных факторов очевидна. Как обстоятельства условия жизни сами по себе не способны сформировать адекватно соответствующую потребностям общества личность сотрудника органов внутренних дел и военнослужащего, а сознательно предпринимаемые усилия вне реальных условий жизни и деятельности, в отрыве от них являются абсолютно бесперспективными.

Часто за пределами рассмотрения остаются проблемы взаимопонимания правовой культуры личности и других форм культуры, исследуются далеко не все условия и факторы, определяющие процесс развития правокультурного комплекса.

Для рассмотрения взаимосвязи объективных и субъективных факторов формирования правовой культуры личности сотрудника органов внутренних дел и военнослужащего необходимо первоначально определить понятия «объективное» и «субъективное».

Объективное в самом общем плане правомерно определить как все то, что существует независимо от сознания. В онтологическом плане объективное означает объективную реальность. В гносеологическом аспекте объективным является такое содержание сознания, которое не зависит от субъекта. В социологическом аспекте свойством объективного обладает такое содержание общественного сознания, которое не зависит от субъекта – человека и человечества. Свойством объективности обладают также все общественные институты и отношения, как материальные, так и духовные.

Субъективное, понимаемое как все то, что зависит от субъекта, проявляется в двух аспектах: гносеологическом и социологическом.



PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com